https://law.bsu.by/novosti/novosti-kafedry-grazhdanskogo-prava/15161-1954-2022.html

##

[Калектыў юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю Гадунова Валерыя Мікалаевіча (1954 – 2022)](https://law.bsu.by/novosti/novosti-kafedry-grazhdanskogo-prava/15161-1954-2022.html)

14 снежня 2022 г. нас пакінуў **прафесар кафедры грамадзянскага права, Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, дэкан юрыдычнага факультэта (1989-2002 гг.), дырэктар** **Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі** **Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2002-2022 гг.), прафесар ГАДУНОЎ ВАЛЕРЫЙ МІКАЛАЕВІЧ.**

В.М. Гадуноў нарадзіўся 5 лютага 1954 г. у в. Садовая Клецкага раёна Мінскай вобласці.

Выбраўшы пасля заканчэння школы юрыдычную спецыяльнасць, ён ніколі і ні пры якіх абставінах ёй не здраджваў, як і не здраджваў сваёй роднай Alma Mater. Біяграфія Настаўніка, як і яго працоўная кніжка вельмі простая – гэта Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

1976 г. – заканчэнне юрыдычнага факультэта БДУ.

1979 г. – заканчэнне аспірантуры БДУ па кафедры грамадзянскага і сямейнага права і размеркаванне на пасаду выкладчыка роднай кафедры.

1980 г.– абарона кандыдацкай дысертацыі на тэму «Прававыя пытанні арганізацыі пастаўкі прадукцыі па прамых доўгатэрміновых гаспадарчых сувязях» пад навуковым кіраўніцтвам дэкана юрыдычнага факультэта, загадчыка кафедры грамадзянскага і сямейнага права, доктара юрыдычных навук, прафесара В.Ф. Чыгіра. Гэта стала першай прыступкай да паступовага ўзыходу па навукова-выкладчыцкай лесвіцы – старшы выкладчык, дацэнт кафедры грамадзянскага і сямейнага права, што суправаджалася пашырэннем і ўскладненнем абавязкаў.

1987 г. – намеснік дэкана завочнага факультэта БДУ.

1989 г. – лёсавызначальны ў біяграфіі – гэта абранне на пасаду дэкана юрыдычнага факультэта БДУ, на якой наш Настаўнік і Кіраўнік працаваў да 2002 г.

Гэта быў вельмі няпросты і складаны час Перабудовы і крызісу савецкай дзяржаўнасці, фарміравання новай Беларусі і пошуку шляхоў развіцця нацыянальнай прававой сістэмы, а таксама яе адукацыйнага складніку. Адначасова ў 1993 г. В.М. Гадуноў быў абраны загадчыкам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ, змяніўшы на гэтай пасадзе легендарнага В.Ф. Чыгіра.

На пасадзе дэкана В.М. Гадуноў раскрыў свае выключныя арганізацыйныя і чалавечыя якасці. Ён забяспечыў развіццё нацыянальнай юрыдычнай адукацыі ў перыяд, калі сама прафесія выкладчыка была неперспектыўнай, і здавалася, што факультэт можа застацца без супрацоўнікаў, а прававая сістэма – без належна падрыхтаваных кадраў.

Пры непасрэдным удзеле Дэкана ў БДУ быў створаны кластэр юрыдычнай адукацыі – Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі і Юрыдычны каледж.

З 1998 г. па 2002 г. В.М. Гадуноў выконваў абавязкі дырэктара ўказанага Інстытута на грамадскіх пачатках, а з студзеня 2002 г. быў прызначаны яго дырэктарам. Па ініцыятыве Дэкана на факультэце былі адкрыты спецыяльнасці “Эканамічнае права” і “Паліталогія”, пачалася падрыхтоўка юрыстаў на базе першай вышэйшай адукацыі.

Абавязкі кіраўніка і арганізатара не перашкаджалі навуковым даследаванням, што дазволіла ў 2004 г. абараніць пад навуковым кансультаваннем доктара юрыдычных навук, прафесара, Заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь В.Ф. Чыгіра доктарскую дысертацыю на тэму «Прававыя сродкі забеспячэння дзяржаўных патрэб у таварах, работах і паслугах» і атрымаць у 2006 г. вучонае званне “Прафесар”.

Высокія прафесійныя якасці Вучонага і Арганізатара актыўна выкарыстоўваліся дзяржаўнымі органамі і ўстановамі. Ён неаднаразова ўключаўся ў рабочыя групы па распрацоўцы базавых нарматыўных прававых актаў (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г., Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь 1999 г., іншыя заканадаўчыя акты), быў членам Навукова-кансультатыўных саветаў (з 1996 г. па 2011 г. – намеснік старшыні і член Прававога кансультатыўнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, член Навукова-кансультатыўных саветаў пры Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь і інш.), выконваў абавязкі арбітра (Міжнародны цэнтр па ўрэгуляванню спрэчак пры Эканамічным Судзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце і Міжнародны арбітражны (трэцейскі) суд «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў»).

В.М. Гадуноў унёс сур’ёзны ўклад у развіццё беларускай юрыдычнай навукі. З 2005 г. па 2013 г. ён з’яўляўся вучоным сакратаром і намеснікам старшыні экспертнага савета па юрыдычных навуках Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. З 2013 г. – член Прэзідыума ВАК Рэспублікі Беларусь. Уваходзіў у склад Міжведамаснага савета па праблемах дысертацыйных даследаванняў у галіне права. Ён аўтар значнай колькасці работ па праблемах грамадзянскага і гаспадарчага права, у тым ліку дзьвюх манаграфій, глаў у падручніку і практыкуме па грамадзянскаму праву, практыкуме па гаспадарчаму праву, а таксама навучальных дапаможнікаў па сямейнаму праву. Пад навуковым кіраўніцтвам В.М. Гадунова падрыхтавана 10 кандыдатаў юрыдычных навук.

Заслугі В.М. Гадунова неаднаразова адзначаліся дзяржавай. Гэта шматлікія граматы і падзякі дзяржаўных органаў, медаль «За працоўныя заслугі» (2011 г.), ганаровае званне “Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь” (2017 г.).

Наш Кіраўнік і Настаўнік запомніўся як сціплы, працавіты, ветлівы чалавек, які ніколі за пасадай не ігнараваў сваіх калег, іх патрэбы і праблемы. Кожны з нас знаходзіў падтрымку і добрае слова, таму сумная навіна аб заканчэнні жыцця В.М. Гадунова з глыбокім болем аддаецца ў нашых сэрцах.

Вечная памяць Вам, Валерый Мікалаевіч, наш Настаўнік, наш Кіраўнік, наш Дэкан і проста Вялікі Чалавек.

Калектыў юрыдычнага факультэта БДУ.